Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры
Рэспубліканскі фонд імя братоў Гарэцкіх
Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры
Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі

# МАКСІМ І ГАЎРЫЛА ГАРЭЦКІЯ. ЖЫЦЦЁ І ТВОРЧАСЦЬ

## (прысвячаецца 125-годдзю з дня нараджэння Максіма Гарэцкага)

Матэрыялы XXVI Гарэцкіх чытанняў

Мінск, 19 красавіка 2018 г.

Репозиторий БарГУ

Мінск
РІВШ
2018

УДК 882.6.09 + 882.6(092)
ББК 83.3(4Беи)
М17

Р э к а м е н д а в а н а
кафедрай літаратурна-мастацкай крытыкі
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
(пратакол № 14 ад 28 чэрвеня 2018 г.)

Р э д а к ц ы й н а я к а л е г і я:
*Р. Гарэцкі* (адк. рэд.), *Я. Аношка*, *В. Губская*,
*Т. Грамадчанка*, *К. Унучак*

Репозиторий БарГУ

М17 **Максім** і Гаўрыла Гарэцкія. Жыццё і творчасць (прысвячаецца 125-годдзю з дня нараджэння Максіма Гарэцкага) : матэрыялы XXVI Гарэцкіх чытанняў, Мінск, 19 красав. 2018 г. / Дзярж. музей гісторыі бел. літ., Рэспубліканскі фонд імя братоў Гарэцкіх, Цэнтр даследав. бел. культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі; Р. Гарэцкі (адк. рэд.). – Мінск : РІВШ, 2018. – 166 с.
ISBN 978-985-586-175-2.

У зборніку прыведзены даклады і выступленні ўдзельнікаў XXVI Гарэцкіх чытанняў, якія прысвечаны жыццю і творчасці выдатных дзеячаў беларускага нацыянальнага руху XX стагоддзя братоў Гарэцкіх: класіка беларускай літаратуры, пісьменніка, літаратуразнаўцы, крытыка, рэдактара-выдаўца, мовазнаўцы, фалькларыста, педагога, публіцыста, грамадскага дзеяча Максіма Іванавіча і аднаго з заснавальнікаў Беларускай акадэміі навук, эканаміста, дэмографа, географа, геолага, археолага, грамадскага дзеяча, акадэміка Гаўрылы Іванавіча.
Адрасаваны шырокаму колу чытачоў.

**УДК 882.6.09 + 882.6(092)**
**ББК 83.3(4Беи)**

**ISBN 978-985-586-175-2**

© Афармленне. ДУА «Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы», 2018

# СЕКЦЫЙНЫЯ ПАСЯДЖЭННІ

## ДАКЛАДЫ

**Таццяна Астапчык.** Некадыфікаваныя прыметнікі-кампазіты
ў творах Максіма Гарэцкага і Рычарда Олдынгтана……………………………45

**Таццяна Багарадава.** Аповесць М. Гарэцкага ў кантэксце
сусветнай літаратурнай ваеннай праблематыкі……………………………..…..50

**Вольга Буйноўская.** “Слова пра паход Ігаравы”
ў беларускіх перакладах 20-х гадоў ХХ стагоддзя……………………………...55

**Таццяна Ганчарова-Цынкевіч.** Рэвалюцыйная тэматыка
апавяданняў Максіма Гарэцкага ………………………………………………...61

**Любоў Глазман.** Сродкі адлюстравання асобаснай рэфлексіі
ў эпісталярыях М. Гарэцкага і Л. Андрэева……………………………….......65

**Вольга Губская.** Ранняя проза Максіма Гарэцкага:
ад рэальнага факта да мастацкага вобраза………………………………………69

**Алена Гурская.** Мастацкая трансфармацыя вобраза інтэлігента
ў беларускай прозе ХХ ст. (М. Гарэцкі, М. Стральцоў, В. Гігевіч)……………73

**Вера Дайлідка.** Апавяданні Максіма Гарэцкага “Рускі”,
“На этапе”, “Генерал” праз прызму наратыўных прыёмаў ……………………79

**Кацярына Ермаковіч.** Эпісталярная спадчына сям’і Гарэцкіх
як сродак фарміравання каштоўнасна-светапоглядной кампетэнцыі
вучняў: аксіялагічны падыход …………………………………………………...84

**Генадзь Кажамякін.** Адлюстраванне падзеяў 1917-1920-х гадоў
у творчасці Максіма Гарэцкага..........................................................................89

**Жанна Косціна.** Беларуская літаратура ХІХ стагоддзя
ў тэарэтыка-крытычных матэрыялах Максіма Гарэцкага…..…………………..93

**Галіна Курыленка.** Што ёсць “Буйніцы і драбніцы”
для Максіма Гарэцкага ў філасофскім асэнсаванні рэчаіснасці………........…..97

**Таццяна Лабада**. Максім і Леў Багдановічы
ў Першай сусветнай вайне: погляд з тылу і фронту…………………………...101

Репозиторий БарГУ

***Жанна Косціна***
*(Баранавічы)*

## БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА XIX СТАГОДДЗЯ Ў ТЭАРЭТЫКА-КРЫТЫЧНЫХ МАТЭРЫЯЛАХ МАКСІМА ГАРЭЦКАГА

Літаратуразнаўца, тэкстолаг, крытык Міхась Іосіфавіч Мушынскі, ацэньваючы «Гісторыю беларускае літаратуры» Максіма Гарэцкага, сцвярджае, што «напісана яна мастаком слова» [3, с. 333]. Гэта неабходна адзначыць, бо тэарэтык літаратуры, літаратуразнаўца выкарыстоўвае неабходны інструментарый для разбору, аналізу, стварэння новага матэрыялу, тэарэтык літаратуры мусіць выпрацоўваць, прапаноўваць новыя метадалагічныя падыходы да разгляду мастацкага тэксту.

Менавіта як гісторык літаратуры, тэарэтык беларускага літаратурнага працэсу выступае Максім Гарэцкі, выбіраючы імёны тых прадстаўнікоў шматмоўнага мастацтва слова Беларусі XIX стагоддзя, якія, на яго думку, прадстаўлялі сапраўдную творчасць, бо яно «адбівала тагачаснае народнае жыццё». Наш класік першы, хто прапанаваў перыядызацыю Новай беларускай літаратуры. У аснове падзелу ляжаў факт гісторыі, а таксама моўная абалонка твораў, у меншай ступені літаратурныя кірункі і школы. Якраз пачатак літаратуры XIX стагоддзя ён называе Адраджэннем і звязвае яго з панаваннем рамантызму ў еўрапейскім мастацтве: «Адраджэнне нашае літаратуры пачалося з першых гадоў 19-га веку пад уплывам рамантызму і ў залежнасці ад розных прычын. <…> Рэвалюцыйныя ідэі даходзілі з Заходняе Еўропы ў наш край і рабілі пэўную змену ў настроях грамадзянства, галоўным чынам, у настроях больш дэмакратычнай моладзі. У часе ж напалеонаўскіх войн многія жыхары нашага краю пабывалі самі ў Заходняй Еўропе, на свае вочы бачылі тамтэйшае жыццё, прыходзілі да пэўных вывадаў ад параўнання з ім жыцця ў сваім родным краі. Ветэраны тых войн, набраўшыся і рэвалюцыйнасці і рамантычнасці, а маючы папулярнасць выдатных людзей уваччу моладзі, шчапілі ёй новыя думкі й настроі ў самых глухіх мядзведжых кутах краю, дзе дажывалі свае дні, вярнуўшыся дамоў» [2, с. 165]. У артыкуле пра «Энеіду навыварат» даследчык хоць і не ўзгадвае філаматаў і філарэтаў (Адама Міцкевіча, Тамаша Зана, Ігната Дамейкі, Францішка Малеўскага і інш.), але дзейнасць навуковых сіл Літвы і Беларусі, якія сабраў вакол сябе Віленскі ўніверсітэт, ацэньваў высока, бо ён «пасеяў і паглыбіў у грамадзянстве і моладзі зацікаўленасць мінуўшчынай свайго краю, паклаў падваліны ў яго навуковае пазнанне, развіў краёвыя тэндэнцыі, кіраваў асветаю і духоўным развіццём краю» [2, с. 166]. Трэба адзначыць, што Максім Гарэцкі быў адным з аўтараў «Праграмы збірання вуснай народнай творчасці», надрукаванай у «Нашым краі» за 1925 год. Гэта вельмі блізкі па змесце дакумент да Інструкцыі, складзенай па ініцыятыве Францішка Малеўскага для збірання «статыстычных» звестак з тэрыторыі ўсяго былога Вялікага Княства Літоўскага – называлася яна «Геаграфічнае апісанне, ці Інструкцыя ў збіранні звестак для вывучэння парафіі». Згодна з гэтай «Інструкцыяй», філаматы

Рэпазіторый БарДУ

і філарэты па выездзе ў родныя мясціны павінны былі даць падрабязнае апісанне сваёй парафіі, асвятліўшы такія пытанні: геаграфічнае становішча, велічыня тэрыторыі, рэльеф мясцовасці, дарогі, рэкі, каналы, клімат, саслоўі насельніцтва, нацыянальны склад, веравызнанне, гаспадарка, асвета, звычаі і абрады. «Акрамя гэтага, – сцвярджае Кастусь Цвірка ў артыкуле «Паданне пра філаматаў, або Доля аднаго пакалення, – інструкцыя патрабавала адказаць яшчэ на шэраг пытанняў: на якой мове размаўляюць розныя слаі насельніцтва, якія сямейныя і гадавыя спраўляюцца святы і ўрачыстасці і як спраўляюцца, якія бытуюць забабоны, у што людзі апранаюцца, якое ў іх жыллё, грамадскія звычаі, сямейныя ўзаемаадносіны» [4, с. 8]. Вядома, што падобнымі праграмамі, інструкцыямі карысталіся многія збіральнікі вуснай народнай творчасці, але распачала такую асветніцкую дзейнасць моладзь Віленскага ўніверсітэта ў пачатку XIX стагоддзя.

Максім Гарэцкі, прааналізаваўшы шэраг твораў Яна Чачота, напісаных па-беларуску, дае такую ацэнку «шляхотнаму рамантыку»: «1) ён адчувае мужыцкае гора, але па-панску і рамантычна; пяе аб тым горы – мужыцкім голасам, але на панскі і рамантычны спосаб; 2) ён зусім не адчувае нацыянальнага гнібення беларусаў; 3) творы яго дыдактычны, яны навучаюць, як трэба жыць. Дзеля таго, што беларуская творчасць Чачота стаяла на апалячанай шляхоцкай дарозе, ён, як паэт не класавы і не нацыянальны, не мог вырасці да памыснай велічыні» [2, с. 189]. Зразумела, аўтар «Гісторыі беларускае літаратуры» меў уласны погляд на ролю пачынальнікаў, які грунтаваўся на тагачасным сацыялагічным метадзе. Згодна з ім развіццё літаратуры надзвычай моцна абумоўлена сацыялагічнымі (грамадскімі) фактарамі. Шляхотныя рамантыкі, на думку мастака слова, цягнуліся да народнае паэзіі, але «развіццё іхнае творчасці на народным грунце было абмежана пэўнымі рамкамі. Галоўнаю прычынаю гэтых рамак была іх належнасць да класа паноў. Погляд на літаратуру ў народнай мове быў у іх несур'ёзны, спараджоны рамантычнай настроенасцю. Яны пісалі дзеля задаволення свайго сэрца, свайго рамантычнага пачуцця, у лепшым выпадку ставячы сабе некаторыя заданні ў кірунку паляпшэння долі народа, змякчэння панскіх адносін да мужыкоў і развіцця краёвае культуры. Такіх пісьменнікаў-этнографаў было досыць многа» [2, с. 175]. Пісьменнікам-этнографам, «бліжэй падышоўшых да літаратурнай творчасці», Максім Гарэцкі называе Яна Баршчэўскага, які, перадаўшы «беларускае жыццё, беларускі дух, беларускую душу» ў творы «Шляхціц Завальня, ці Беларусь у фанатастычных апавяданнях», карыстаўся народнай міфалогіяй, апісваў быт сялян для таго, каб канкрэтызаваць вобраз шляхціца. Перадаючы змест вершаванай паэмы «Рабункі мужыкоў», крытык з пазіцый сацыялагічнага літаратуразнаўства даваў ацэнку вершу Яна Баршчэўскага: «Беларускае жыццё, сялянскі побыт паказваў ён неглыбока; да сялянскага пытання адносіўся безыдэйна, не так, як таго вымагалі ад яго сапраўдныя заданні народнага пісьменніка. І твор яго мог пайсці ў народныя гушчы толькі дзеля несвядомасці сялянства, любові яго да ўсякай паэзіі ў роднай мове і асаблівай прыхільнасці да смяхотных рэчаў» [2, с. 175]. На нашу думку, Максім Гарэцкі, аналізуючы беларускамоўную творчасць Яна

Рэпазіторый БарДУ

Чачота, Аляксандра Рыпінскага, Яна Баршчэўскага, Паўлюка Бахрыма, Кастуся Каліноўскага вызначае два кірункі рамантызму, што ўзіклі ў літаратуры XIX стагоддзя – шляхотны рамантызм і мужыцкі рамантызм. Радыкальныя паэты-рамантыкі з паноў выступалі як настаўнікі, добрыя бацькі для сваіх сялян, якія рознымі спосабамі – дыдактычнымі павучаннямі, іранічным, саркастычным асуджэннем – імкнуліся выправіць заганы ніжэйшага класу. Мужыцкія рамантыкі, напрыклад, Паўлюк Бахрым, аўтар верша «Зайграй, зайграй, хлопча малы…» і верагодны аўтар «Гутаркі Данілы са Сцяпанам», Кастусь Каліноўскі адчувалі народнае гора, імкнуліся пашырыць беларускае слова, «калі хацелі закрануць струны беларускай душы» [2, с. 231]. Ацэньваючы высока жанр гутаркі, яе шматвобразнасць, арыгінальныя народныя звароты мовы, іх даволі гладкі і лёгкі верш аналітык-літаратуразнаўца зноў акцэнтаваў увагу на розная задачы шляхотнага рамантызму і мужыцкага: «Гістарычна-літаратурнае значэнне іх ёсць у тым, што яны хоць троху дапаўнялі пусткі, створаныя аднабокасцю шляхоцкай літаратуры, малявалі й тую жорсткую нагату прыгоннага жыцця, якую рамантыкі-паны або абміналі, або паказвалі ў вопратках шляхоцкага светагляду. Акром таго, гэтыя творы заўсёды варушылі ў нашым народзе, у яго пабыўшых у школе дзяцей, у яго інтэлігенцыі думку аб тым, што беларуская літаратура была, што яе можна й далей развіваць, далей можна тварыць нешта падобнае» [2, с. 194].

Кірункі развіцця айчыннай паэзіі гісторык літаратуры раздзяляў па прынцыпе ўплываў ідэалогіі суседніх культур і самога беларускага народа – вусная народная паэзія, літаратура апалячанае шляхты і расійска-беларускі кірунак. Апошні прадстаўлялі невядомы аўтар імяннінага верша, надрукаванага ў расійскім выданні «Маяк» (1843) літаратарам Цітовічам і Павел Шпілеўскі. Са шкадаваннем Максім Гарэцкі пісаў пра прадстаўніка беларускага кірунку ў расійскай белетрыстыцы, бо «сам ён, узгадаваны ў расійскай школе, закінуты на чужыну, зарабляючы на хлеб пісаннем у расійскай мове, так пераняўся расійскаю культураю, што выключна ў роднай мове нічога не напісаў, хоць і багата ўжываў у сваіх расійскіх творах беларускіх слоў і цэлых размоў» [2, с. 194]. Творы этнографа былі адрасаваны адукаванаму чытачу, прыхільніку народнай творчасці, «інтэлігенцыі расійскай культуры». Ён не быў прыхільнікам беларушчыны, якім стаў Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч, які паходзіў з апалячанай беларускай шляхты.

Аўтар «Гісторыі беларускае літаратуры» прысвяціў цэлы артыкул, ужо па сённяшнім вызначэнні класіку беларускай літаратуры, Вінцэнту Дуніну-Марцінкевічу, таму што ён быў «самым плодным і найбольш адданым беларускай творчасці пісьменнікам з апалячанай беларускай шляхты ў 50–60 гадах 19-га веку» [2, с. 203]. Раскрываючы вясёлы, жыццярадасны пафас аповесці «Гапон», Максім Гарэцкі рабіў спробы параўнання творчай манеры Чачота і Дуніна-Марцінкевіча зыходзячы з пазіцый біяграфічнага метаду даследавання, сутнасць якога заключаецца ў тым, што біяграфія і асоба пісьменніка разглядаюцца ў якасці вызначальных момантаў мастацкай творчасці: «Аўтар у гэты час карыстаўся ўсімі ўцехамі спакойнага, здавольнага жыцця. Але навакол ён бачыў розныя крыўды ў жыцці прыгоннага сялянства. І яму, як

Рэпазіторый БарДУ

чалавеку па натуры добраму й справядліваму, хацелася, як калісьці і Чачоту, «каб усім было добра». З другога боку, маючы ў натуры многа вясёласці, жартаўлівасці, ён не мог так засмуціцца, як Чачот, а яго асабістыя радасці панскага жыцця заміналі яму глыбей праняцца цярпеннямі прыгоннага люду» [2, с. 203].

Пачаткам навейшай (вызначэнне самага аўтара Гісторыі) літаратуры Максім Гарэцкі называе канец 80-х гадоў XIX стагоддзя, калі змяніліся погляды пісьменнікаў на мову, на яе літаратурнае значэнне і будучыню. Пазітыўную ролю ў працэсе вызвалення беларускага прыгожага пісьменства ад пераймання чужых літаратур, раскрыцця беларускага нацыянальнага духу адыграў Францішак Багушэвіч. У ацэнцы ідэйна-мастацкага зместу твораў Мацея Бурачка і Сымона Рэўкі з-пад Барысава прыхільнік сацыялагічнага метаду сцвярджаў: «Самыя крайнія ў радыкалізме сваіх перакананняў людзі могуць знайсці ў паэзіі Багушэвіча толькі тую загану, што ён сам не пакінуў жыцця дробнабуржуазнай сферы, з якой выйшаў, і хаця тыповых прадстаўнікоў яе па-грамадзянску ненавідзеў, аднак, мусіць, па крыві ён і жалеў іх і далей за сякучай сатыры супраць іх, больнай і для самога, не йшоў. Сацыяльны элемент у Багушэвіча ніколі не пераходзіў у партыйна-сацыялістычны кірунак» [2, с. 203]. Сучасныя літартуразнаўцы называюць Францішка Багушэвіча прадстаўніком новай мастацкай сістэмы рэалізму, а напрамак яго творчасці – крытычны рэалізм, які асуджаў сацыяльнае ўладкаванне, дзе прыніжаецца асоба, пануе культ золата, багацця. Але Максім Гарэцкі не называе Багушэвіча пісьменнікам-рэалістам. Магчыма, ён прытрымліваўся меркавання, што рамантызм стаў той сістэмай, якая абудзіла зворот да катэгорый народнасці, нацыянальнасці, беларушчыны.

Сучасная даследчыца беларускага літаратурнага працэсу І. Багдановіч слушна сцвярджае новую канцэпцыю перыядызацыі: «Пры магчымасці больш дэталёвага падзелу беларускай літаратуры на перыяды адпаведна грамадска-гістарычным зменам, якія адбываліся праз адно-два дзесяцігоддзі ў XIX ст. і праз пяць-сем год на пачатку XX ст., слушным, на нашу думку, з’яўляецца вылучэнне канцэпцыі развіцця літаратуры як адзінай плыні ў першай трэці XIX – першай трэці XX ст.: развіццё літаратуры праходзіць пад знакам нацыянальна-вызваленчага змагання з яўнай дамінантай рамантычных стылёвых прыкмет» [1, с. 3-4].

У «Гісторыі беларускае літаратуры», напісанай у часы нацыянальнага адраджэння, на хвалях рэвалюцыйных пераўтварэнняў і актыўнага стварэння новага беларускага грамадства, засталіся не запатрабаванымі польскамоўныя творы тых аўтараў, якія служылі нашай зямлі, бо тэндэнцыя сацыялагізацыі, а пасля і вульгарызацыі падыходау да разгляду літаратуры станавілася асноўнай.

**Літаратура**

1. Багдановіч, І. Э. Авангард і традыцыя: Беларуская паэзія на хвалі нацыянальнага адраджэння / І. Э. Багдановіч. – Мінск: Бел. навука, 2001. – 387 с.

Рэпазіторый БарДУ

2. Гарэцкі, М. Гісторыя беларускай літаратуры / М. Гарэцкі. – Мінск: Маст. літ., 1992. – 479 с.
3. Мушынскі, М. Падзвіжнік Малой Багацькаўкі: жыццёвы і творчы шлях Максіма Гарэцкага / М. Мушынскі – М. Мушынскі. – Мінск: Бел. навука, 2013. – 543 с.
4. Філаматы і філарэты: зб. / уклад. К. Цвірка – Мн. : Бел. кнігазбор, 1998. – 400 с.

*Галіна Курыленка*
*(Мінск)*

## ШТО ЁСЦЬ “БУЙНІЦЫ І ДРАБНІЦЫ”ДЛЯ МАКСІМА ГАРЭЦКАГА Ў ФІЛАСОФСКІМ АСЭНСАВАННІ РЭЧАІСНАСЦІ

Рэпозіторый БарГУ

Перад прадстаўнікамі беларускай вербальнай культуры ў першай чвэрці XX стагоддзя паўстала надзвычай важная задача: вярнуць амаль страчаныя за апошні час былыя веліч і магутную ўплывовасць беларускага слова. Неабходна было нанова даказаць усяму цывілізаванаму свету, а недзе нават і самім сабе яго вартасць, яго сілу, яго моц. А праз гэта заадно рэалізаваць спробу пазбаўлення комплексу нацыянальнай непаўнацэннасці, навязанага звонку і сфарміраванага ў свядомасці пэўнай часткі беларусаў у выглядзе паняцця “дзеравеншчына”. Асэнсаванне і ўсведамленне гэтых працэсаў даступна было далёка не кожнаму.

Магчыма аднымі з першых, хто задумаўся над вырашэннем згаданых праблем былі Якуб Колас (апавяданне “Дзеравеншчына”) і Максім Гарэцкі з яго творамі “За што?” (“Ціхія песні”) і “Ціхая плынь”.

Варта адзначыць, што і ў Якуба Коласа, і ў Максіма Гарэцкага індывідуальныя сістэмы духоўных каштоўнасцяў і светапогляд фарміраваліся ў той час, калі асноўнымі сродкамі спасціжэння рэчаіснасці былі здольнасці да рэфлексіі (ці самарэфлексіі) і адначасова здольнасці да аналітыкі. А гэта, як вядома, з’яўляецца неад’емнымі састаўнымі кампанентамі філасофскага складу розуму альбоў цэлым складу самой філасофіі як навукі. Геніяльнае сцвярджэнне Гарацыя аб тым, што быць мудрым – гэта пачатак і прычына таго, каб правільна пісаць, – цалкам можна адрасаваць абодвум пісьменнікам. Сапраўды, чалавек, які здольны думаць, рэфлексаваць – асабліва калі гэта яшчэ і пісьменнік – сапраўднае дасягненне любога грамадства.

Прыгадаем, што філасофія зараджаецца яшчэ ў часы Антычнасці, але самастойнае значэнне набывае толькі ў эпоху Асветніцтва, якраз тады, калі для нашай культуры, на жаль, не было спрыяльных магчымасцяў для рэалізацыі яе беларускамоўнага варыянта.

І тым не менш, калі ў Еўропе ішло фарміраванне і распаўсюджванне філасофскіх плыныняў ці сістэм, у беларускай культуры адбываўся працэс цеснага сінтэзу філасофіі і літаратуры, працэс узаемадзеяння, узаемазвязанасці